УДК 070(091):947.6

В. У. Коваль, асістэнт

# АСВЯТЛЕННЕ ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ДЫЯСПАР НА СТАРОНКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАНЦКАЙ ПЕРЫЁДЫКІ

The Belarusian diasporan press devoted attention to Ukrainians. Among the numerous aspects of Belarusian diasporan life, one that will undoubtedly receive considerable attention from researchers is cultural ties of Belarusian and Ukrainian emigrants. The spiritual base of the national selfdetermination, manifestation of identity became the social, political, educational, scientific organizations, national mass media, cultural centers and churches created by Belarusians and Ukrainians. The post-war period was the time of the "cold war" in the world, therefore the influence of press on the public opinion became important in the information war. The main topic of those periodicals was anti-communism. The research is based on materials of Belarusian emigrant press.

**Уводзіны**. Перыядычныя выданні беларускай дыяспары з'яўляюцца адной з асноўных гістарычных крыніц па гісторыі эміграцыі. Менавіта на старонках газет і часопісаў можна прасачыць развіццё палітычных плыняў за мяжой, грамадскіх аб'яднанняў, культурных асяродкаў і шматлікія іншыя моманты штодзённага жыцця нашых суайчыннікаў у розных краінах свету. У гісторыі XX ст. можна вылучыць шэраг палітычных і эканамічных эміграцыйных хваляў беларускага і ўкраінскага народа, аналіз якіх дазволіць зрабіць высновы пра ролі перыядычных выданняў эмігрантаў.

**Асноўная частка.** Прэса беларускай эміграцыі з'яўляецца важнай крыніцай па даследаванні палітычных, культурных, адукацыйных, эканамічных і рэлігійных кантактаў беларусаў з іншымі народамі ў замежжы. І трэба заўважыць, што культурныя сувязі беларускай і ўкраінскай дыяспар заўсёды былі і застаюцца шчыльнымі. І на гэта ёсць шэраг прычын: агульная гісторыя, роднасць моваў, падобныя культурныя традыцыі і палітычныя погляды. Самі беларускія эмігранты пра ўкраінцаў пісалі наступным чынам: «Сярод беларусаў і ўкраінцаў, як у краі, так і на эміграцыі, існуе крывёй замацаванае братэрства, калі абодва народы не называць сябе інакш, як гэта часта бывае – «браты ўкраінцы» й «браты беларусы» [1].

Гісторыя развіцця перыядычных выданняў беларускай эміграцыі распачалася на пачатку XX ст. Развіццё прэсы дыяспары неабходна звязаць з эміграцыйнымі хвалямі. Першая хваля беларускай эміграцыі на пачатку XX ст. была эканамічнай. Людзі выязджалі за мяжу, каб шукаць там лепшай долі. Эканамічная эміграцыя ў адрозненні ад палітычнай дазваляе новым жыхарам краіны вельмі хутка адаптавацца ў новай краіне, беларускія эмігранты на пачатку XX ст. у большасці не трымаліся за свае карані, не захоўвалі культурную адметнасць. Амерыканскі вучоны Морыс Дэйві піша: «Амерыканскія статыстыкі не бачаць адрозненняў паміж вялікаросамі, беларусамі і маларосамі, але ёсць падставы меркаваць, што вялікаросы пераважалі ў расійскай эміграцыі да 1905 г., тым часам, як пасля гэтага пачалі ў большай колькасці эміграваць украінцы і беларусы» [2].

Да пачатку Першай сусветнай вайны беларусы і ўкраінцы выязджалі за мяжу зарабіць грошай, стварыць сабе лепшыя ўмовы жыцця. Як правіла, радзіму пакідалі сяляне, большасць з якіх – збяднелыя. У перыяд масавага выезда сялян кошты на гаспадарку падалі, часта іх спецыяльна збівалі, таму асноўнай праблемай для эмігрантаў быў пошук грошаў для ад'езда, на аплату паслуг агенству па афармленні дакуметаў.

Наступная хваля эміграцыі пачалася пасля заканчэння Першай сусветнай вайны і з'яўлялася палітычнай. Радзіму пакідалі ўсе тыя, хто веў барацьбу супраць усталявання савецкай улады. Асноўная частка беларусаў і ўкраінцаў абасноўваліся ў Чэхіі, Аўстрыі, Германіі, Францыі, ЗША, Канадзе, Румыніі і Балгарыі. Сярод эмігрантаў былі фактычна ўсе слаі насельніцтва, прычым на Захад выязджалі не толькі заможныя беларусы і ўкраінцы, але і збяднелая частка грамадства.

Працэс афармлення палітычных цэнтраў украінцаў і беларусаў на пачатку стагоддзя адбываўся паступова. Гісторыя развіцця ўкраінскай прэсы эміграцыі пачынаецца значна раней за стварэнне беларускіх эмігранцкіх газет і часопісаў. Адныя з першых перыядычных выданняў украінскай дыяспары сведчаць пра сувязь паміж эмігрантамі розных народаў. Украінскі друк упершыню пачаў публікаваць матэрыялы пра супрацоўніцтва з беларусамі ў 1897 годзе. Першы ўкраінскі каляндар у ЗША паведамляў: «Беларусы пачалі прыбываць у Злучаныя Штаты з заходніх губерняў Расіі пазней за славакаў і русінаў. Беларусы ў сваёй большасці былі праваслаўнай веры» [3]. Дадзеная заўвага сведчыць не толькі пра канстатацыю прысутнасці беларусаў за мяжой, але і пра ўвагу да ўкраінскай эміграцыі.

Адным з першых часопісаў, які выдаваўся ў Злучаных Штатах, стаў часопіс-праграма «Амерыканскі беларус». Выданне выходзіла ў 1930 г. у Чыкага. На старонках «Амерыканскага беларуса» апублікавана інфармацыя пра супрацоўніц-

тва беларусаў і ўкраінцаў. Часопіс здзіўляе шматлікасцю рэклам, ёсць інфармацыя пра беларуска-ўкраінскі банк, матэрыял пра месца сустрэчы беларусаў з украінцамі. Дадзеныя абвесткі дазваляюць зрабіць выснову пра існаванне агульнага бізнесу паміж беларусамі і ўкраінцамі за мяжой на пачатку XX ст.

Усталяванне таталітарнага рэжыму ў Савецкім Саюзе непасрэдна паўплывала на эміграцыю. З канца 20-х гг. яна фактычна была спынена. Магчымасць пераехаць у іншую краіну сусвету заставалася толькі ў жыхароў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да 1939 года. З дадзенай тэрыторыі большасць эмігрантаў выязджала па эканамічных прычынах, у асноўным эміграцыя была працоўнай і сялянскай.

Другая сусветная вайна паклала пачатак новай хвалі эміграцыі, якую даследчыкі называюць палітычнай. Прэса эміграцыі пасля вайны мела не толькі інфармацыйны характар, але і аб’ядноўвала эміграцыю, кансалідавала дыяспару. Асаблівасцю тэматыкі пасляваеннай прэсы беларускай і ўкраінскай эміграцыі стаў апантанны антысаветызм. Відавочна, што выдаўцы часопісаў і газет за мяжой – гэта людзі, якія раней супрацоўнічалі з акупантамі, а пасля вайны – з заходнімі спецслужбамі. Іх палітычная дзейнасць арганічна ўпісалася ў тую «халодую вайну», якую ў пасляваенныя гады вялі краіны Захаду супраць СССР.

Разам з тым, акрамя грамадска-палітычных артыкулаў на старонках перыёдыкі размяшчаўся матэрыял пра культурнае, адукацыйнае, рэлігійнае жыццё эміграцыі. Беларуская эмігранцкая перыёдыка з’яўляецца важнай гістарычнай крыніцай па гісторыі беларускай эміграцыі. Прэса беларускай дыяспары сведчыць пра цыклы дакладаў і выступленняў украінцаў і беларусаў пра сваю Бацькаўшчыну. Напрыклад, артыкул «Рэферат аб Украіне для Беларусаў» [4] распавядае пра выступленне перад беларусамі прадстаўніка Саюза Украінцаў Брытаніі М. Семчышына. У матэрыяле пазначаецца, што дадзены ўкраінска-беларускі вечар з’яўляецца другім з запланаванага цыклу мерапрыемстваў, прысвечаных узаемнаму збліжэнню дыяспар.

Пра культурнае ўзаемадзеянне за мяжой прадстаўнікоў розных дыяспар напісана ў артыкуле «Беларусы, украінцы, летувісы – за адно», выдадзеным ў газеце «Бацькаўшчына». Матэрыял прысвечаны апісанню святкавання ў г. Вангене (французская акупацыйна зона Германіі) 85-х угодкаў паўстання 1863 г. і 110-х угодкаў з дня нараджэння К. Каліноўскага. Дадзены артыкул з’яўляецца тыповым, на старонках эміграцыйнай прэсы дастаткова шмат інфармацыі пра разнастайныя мерапрыемствы, якія аб’ядноўвалі эмігрантаў і апісвалі агульную беларускую і ўкраінскую гістарычную спадчыну. Аўтар, які падпісаўся псеўданімам Госць, пазначыў: «Прадстаўнік старэйшага беларускага пакаленьня ў сваёй прамове выявіў супольны шлях змаганьня Беларусаў і Украінцаў, успомніўшы працы прафесара Кіеўскага Унівэрсытэту Украінца Грушэўскага, ягоную «Гісторыю Украінскага Народу», і Беларуса, таксама прафэсара-гісторыка таго-ж унівэрсытэту, Даўнара-Запольскага зь ягонымі «Асновамі дзяржаўнасьці Беларусі» [5].

Пра жыццё ўкраінскай дыяспары беларускія эмігранты пісалі часцей і больш падрабязна, чым пра іншыя народы. З матэрыялаў можна зрабіць выснову, што беларусы прымалі актыўны ўдзел у нацыянальных святах украінцаў, палітычных і культурных мерапрыемствах. Напрыклад, у артыкуле «На сустрэчы Украінцаў Амэрыкі» [6] распавядаецца пра штогадовую сустрэчу ўкраінцаў Паўночнай Амерыкі, на якую ў якасці гасцей запрасілі беларусаў.

Часта матэрыялы газет і часопісаў мелі інфармацыйны характар, публікаваліся абвесткі. Матэрыял «Памятнік Тарасу Шаўчэнку ў Вашынгтоне» распавядае, што плануецца ўрачыстае адкрыццё помніка ўкраінскаму паэту. Рэдакцыя газеты «Беларус» звяртаецца да чытачоў з прапановай прыняць актыўны ўдзел ва ўрачыстасцях украінцаў: «Вельмі пажадана, каб і Беларусы, асабліва тыя, што жывуць у Вашынгтоне й аколіцах, прынялі ўдзел ва ўрачыстасьцях адкрыцьця памятніка Тарасу Шаўчэнку» [7]. Такія абвесткі дапамагалі эмігрантам не толькі падтрымаць украінскіх сяброў, але і кансалідаваць беларускую дыяспару.

Не толькі беларускія эмігранты на старонках сваёй перыёдыкі шмат пісалі пра дзейнасць украінскай дыяспары, але і ўкраінцы шмат увагі ў сваіх матэрыялах аддавалі беларусам. Эмігрант і даследчык гісторыі беларускай эміграцыі Вітаўт Кіпель у сваёй кнізе «Беларусы ў ЗША» пазначае: «Было шмат выпадкаў, калі ўкраінцы запрашалі беларусаў узяць удзел у іхных палітычных мітынгах і культурных імпрэзах. Часам беларусы бралі ў іх удзел, аднак бальшыня беларускіх імігрантаў, на жаль, была тады яшчэ не гатовая выйсці на палітычную арэну й не заўсёды адказвала на гэтыя запрашэньні» [8]. В. Кіпель падкрэслівае, што ўкраінцы на старонках сваёй перыёдыкі часта спецыяльна вялі рубрыку «З беларускага жыцця», бо ведалі, што іх газеты і часопісы чытаюць шматлікія беларусы.

На старонках перыядычных выданняў беларускія эмігранты выключна станоўча пісалі пра дзейнасць антысавецкага падполля на тэрыторыі Беларусі, асабліва шмат матэрыялаў прысвечана асвятленню дзейнасці ўкраінскіх нацыяналістаў.

Антысавецкае падполле Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў на тэрыторыі БССР у пасляваенны перыяд прадстаўляла сабой шма-

тузроўневую структуру, асноўнымі элементамі якой былі замежныя кіруючыя цэнтры, арганізацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі і ўзброеныя фарміраванні Украінскай Паўстанскай Арміі [9]. Формы і метады дзейнасці Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў спалучалі дыверсіі і тэрор у адносінах да прадстаўнікоў савецкай улады і мясцовых актывістаў па прапагандысцкай і агітацыйнай рабоце. Асабліва актыўна дзейнасць антысавецкага падполля на тэрыторыі Беларусі была разгорнута на Палессі. Нягледзячы на мерапрыемствы органаў дзяржаўнай бяспекі і ўнутранных спраў БССР, атрады Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў дзейнічалі да сярэдзіны 1950-х гг.

Праграмныя дакументы антысавецкага ўкраінскага падполля рабілі акцэнт на барацьбе супраць СССР і заклікалі да пабудовы ўкраінскай незалежнай дзяржавы. Менавіта антысавецкі кірунак дзейнасці ўкраінскіх нацыяналістаў цікавіў выдаўцоў беларускай перыёдыкі.

Напрыклад, артыкул «Гутарка з Камандзірам УПА» выключна станоўча ацэньвае дзейнасць арганізацыі. Інтэрв’ю для газеты «Бацькаўшчына» падрыхтаваў У. Курыловіч. Прозвішча камандзіра УПА спецыяльна не называецца, у артыкуле толькі пазначаецца, што ён нядаўна прыбыў у Германію з Бацькаўшчыны разам з групай украінскіх паўстанцаў, а цяпер знаходзіцца ў Мюнхене. Зразумела, што сапраўдныя імёны ўкраінцаў не падаюцца ў выданні з мэтай бяспекі.

Камандзір у інтэрв’ю распавядае пра свой рух, сувязь з беларусамі, падкрэслівае станоўчае стаўленне беларусаў да ўкраінцаў: «Беларускае насельніцтва адносілася да нас вельмі прыхільна. Яно вельмі цікавілася нашым змаганьнем, пыталася нас, калі мы ўжо канчаткова зьнішчым бальшавікоў, давала нам ахвотна ўсялякія інфармацыі й наагул памагала, чым магло» [10].

Беларускія эмігранты актыўна пісалі пра навіны, звязаныя з дзейнасцю антысавецкіх украінскіх фарміраванняў, змены ў кіраўніцтве, праведзеныя мерапрыемствы. Артыкул «Сьмерць Змагара за вызваленьне Украіны» распавядае пра гібель аднаго з кіраўнікоў Украінскай Паўстанскай Арміі генерала Тараса Чупрынкі. У матэрыяле пазначаецца, што месца кіраўніка фарміраванняў УПА пасля смер ці Т. Чупрынкі заняў палкоўнік Васіль Коваль. У газеце рэдакцыя выказвае спачуванне ўсяму ўкраінскаму народу і падкрэслівае палітычную сувязь беларусаў і ўкраінцаў на эміграцыі: «Страта генерала Чупрынкі – гэта страта ня толькі Украінскага Народу, але й усіх волялюбівых народаў, што знаходзяцца ў бальшавіцкай няволі й змагаюцца за сваё вызваленьне. Таму ёсьць гэта таксама стратай і для Беларускага Народу, які, падобна, як Народ Украінскі, бесьперапынна змагаецца з адным і тым самым ворагам за сваё вызваленьне й дзяржаўную незалежнасць» [11]. Беларускія эмігранты на старонках сваёй прэсы вы- ключна рамантычна і гераічна малююць вобраз украінскіх нацыяналістаў.

Палітычныя абвастрэнні падчас «халоднай вайны» дазволілі выкарыстоўваць прадстаўнікоў разнастайных антысавецкіх арганізацый у якасці аднаго з фактараў дэстабілізацыі сітуацыі ў Савецкім Саюзе. Многія эміграцкія выданні, якія прытрымліваліся антысавецкай ідэйна-палітычнай накіраванасці, прымалі ў гэтай вайне актыўны ўдзел. На старонках беларускамоўных эміграцкіх перыядычных выданняў можна прасачыць развіццё ідэалагічных установак для чытачоў, бо менавіта прэса павінна была адыграць асноўную ролю ў фарміраванні вобраза ворага – Савецкай краіны. Пасля разгрому Германіі шматлікія беларускія эмігранты з ліку ўдзельнікаў калабарацкіх партый і арганізацый сталі сферай пільнай увагі разведак краінамі Захаду. Заходнім спецслужбам было нескладана маніпуляваць лёсамі эмігрантаў, завербаваць іх было лёгка, бо людзі баяліся выкрыцця іх мінулага, пакарання за супрацоўніцтва з немцамі.

Эміграцкія перыядычныя выданні з нумара ў нумар намагаліся пераконваць чытачоў у антысавецкіх меркаваннях, часта паднімалася нацыянальнае пытанне. Пры гэтым неабходна адзначыць, што палітычная крытыка на старонках прэсы была выключна аднабаковая, нельга казаць пра аб’ектыўныя погляды аўтараў прэсы эмігрантаў, бо яны не ўспаміналі пра негатыўныя моманты дзейнасці ўрадаў заходніх краін, а бясконца ганьбілі абсалютна ўсе бакі жыцця ў Савецкім Саюзе. Пра тое, што гэта прэса была палітычнай замовай заходніх спецслужб, сведчыць відавочная аднабаковасць поглядаў, ідэалізацыя заходняга ладу жыцця і палітыкі.

Прадстаўнікі беларускай дыяспары неаднаразова публікавалі матэрыялы па этнаграфічных межах Беларусі. Асаблівую цікавасць выклікала Палессе, бо дадзены рэгіён вылучаецца сваёй адметнасцю, а мяжа паміж БССР і УССР мела ўмоўнае значэнне ў Савецкім Саюзе. Аднак эмігранты лічылі, што тэрыторыя беларускага Палесся на самой справе значна большая. У адным са шматлікіх артыкулаў пра асаблівасці рэгіёна «Беларуская Гомельшчына» аўтар В. Верасень намагаецца вылучыць этнаграфічныя межы ўкраінскай і беларускай мовы. На думку аўтара, паўночная Чарнігаўшчына тыпова беларуская, бо мова дадзенага рэгіёна адрозніваецца ад мовы паўдзёнай Чарнігаўшчыны, дзе яна менш падобная на беларускую: «Калі аўтар гэтых радкоў сваім часам жыў на Дняпры, дзе сустракаюцца цяпер межы БССР і

УССР, дык яму часта даводзілася перакладаць акалічнаму жыхарству ўрадавыя паперы з украінскае мовы, якая была незразумелай, у беларускую мову, якой жыхары гавораць штодзённа» [12]. Неабходна адзначыць, што ўкраінцы на старонках прэсы сваёй дыяспары таксама ўздымалі пытанні межаў, а частку тэрыторыі БССР яны лічылі ўкраінскай. Аўтар артыкула «Беларускае Палесьсе» слушна пазначае: «На поўдні за Прыпяцяй праз суседзства з украінцамі і праз іхныя ўплывы паляшукі набылі колькі асаблівых этнаграфічных рысаў і становяць крыху адрозны ад сярэня- і паўночна-беларускага тыпу характар» [13]. Сапраўды, Палессе спалучае рысы беларускай і ўкраінскай культуры, з'яўляецца адметным памежным рэгіёнам.

Наступная хваля эміграцыі ў Савецкім Саюзе пачалася ў 1967 г., калі дазволілі выезд з СССР без захавання грамадзянства для шматлікіх катэгорый насельніцтва: яўрэяў, армян, немцаў. Дадзеная хваля савецкай эміграцыі вельмі нязначна папоўніла беларускую і ўкраінскую дыяспару, таму нацыянальнай яе назваць нельга.

Пасля распаду Савецкага Саюза і станаўлення незалежных дзяржаў на Захад з Рэспублікі Беларусь і Украіны пачалі выязджаць у асноўным маладыя людзі па эканамічных прычынах, частка з якіх на радзіму не вярнулася. Дадзены працэс працягваецца ў XXI ст. Эканамічныя матывы для эміграцыі насельніцтва краіны негатыўныя менавіта тым, што некаторыя ініцыятыўныя і таленавітыя грамадзяне дзяржавы намагаюцца будаваць сваё жыццё далёка ад Бацькаўшчыны.

Роля перыядычных выданняў эміграцыі ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. змянілася. Паменшылася патрэба ў газетах і часопісах дыяспары з распаўсюджваннем тэлебачання. З'яўленне Інтэрнет-рэсурса таксама непасрэдна паўплывала на развіццё прэсы за мяжой і значна зменшыла яе ўплыў.

**Заключэнне.** Можна зрабіць выснову, што характарыстыкі эміграцыйных хваляў беларускага і ўкраінскага народаў у XX ст. маюць агульныя рысы і асаблівасці. Часта супадаюць прычыны фарміраванняў хваляў, змены сацыяльнага складу дыяспар. Матэрыялы беларускай эмігранцкай перыёдыкі дазваляюць зрабіць выснову пра цеснае культурнае, палітычнае, эканамічнае супрацоўніцтва беларусаў і украінцаў за мяжой Бацькаўшчыны.

### Літаратура


1. Украінцы й Вільня // Бацькаўшчына. – 1949. – № 12. – С. 1.
2. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск: Беларусь, 1993. – С. 14.
3. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск: Беларусь, 1993. – С. 25.
4. Рэферат аб Украіне для Беларусаў // Бацькаўшчына. – 1949. – № 15. – С. 4.
5. Беларусы, украінцы, летувісы – за адно // Бацькаўшчына. – 1948. – № 6. – С. 4.
6. На сустрэчы Украінцаў Амэрыкі // Беларус. – 1963. – № 80. – С. 4.
7. Памятнік Тарасу Шаўчэнку ў Вашынгтоне // Беларус. – 1964. – № 87.– С. 1.
8. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск: Беларусь, 1993. – С. 276.
9. Валаханович, И. А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944 –1953 гг. / И. А. Валаханович. – Минск: БГУ, 2002. – С. 116.
10. Курыловіч, У. Гутарка з Камандзірам УПА / У. Курыловіч // Бацькаўшчына. – 1949. – № 7. – С. 2.
11. Сьмерць Змагара за вызваленьне Украіны // Бацькаўшчына. – 1950. – № 64. – С. 3.
12. Верасень, В. Беларуская Гомельшчына / В. Верасень // Бацькаўшчына. – 1948. – № 17. – С. 3.
13. Караткевіч, М. Беларускае Палесьсе / М. Караткевіч // Палесьсе. – 1955. – № 1. – С. 10.